ДУА «ЕЛКАЎСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Люты 2021 Выпуск № 6

**Звярніце увагу:**

- Турнір "Сябруем з родным словам"
- Занятак "ШАГ".

**У гэтым нумары:**


Тыдзень роднай мовы 1

"У адзінстве народа– сіла незалежнай" 2

Единый день безопасно-сти 3

Народны каляндар. Люты 4


## Тыдзень роднай мовы




Цікава і змястоўна прайшоў ва ўстанове адукацыі Тыдзень роднай мовы (15.02 –20.02). Ён быў прымеркаваны да Міжнароднага дня роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага.

У школе была створана алея беларускіх слоў, значэнне якіх вучні павінны былі растлумачыць; прайшоў конкурс малюнкаў "Па творах беларускіх аўтараў", у якім прынялі ўдзел вучні 3-9 класаў. Ва ўзроставай групе 3-5 клас перамагла вучаніца 5 класа Галонская Марыя (А.Грачанікаў "Верасень"). Сярод вучняў 6-9 класаў лепшымі былі прызнаны афіша да п'есы А.Дударава "Вечар" (Махнач Аліна, 9 клас) і ілюстрацыя да верша У. Караткевіча "Лісце" (Махнач Дзіяна, 8 класа).




Моўны турнір "Сябруем з родным словам", які адбыўся 19 лютага, сабраў юных знаўцаў роднай мовы паспаборнічаць у веданні беларускіх прыказак, загадак, казак, вершаў.

У конкурсе чытальнікаў вершаў беларускіх паэтаў "Гучы, роднае слова!" перамаглі Галонская Марыя, 5 клас (П.Броўка "Калі ласка") і Самайловіч Вікторыя, 7 клас (Л. Багдановіч "Родная мова") Віншуем пераможцаў!

## «У адзінстве народа – сіла незалежнай дзяржавы»

25.02 лютага ў школе прайшоў чарговы занятак “ШАГ”. Вучні 8-11 класаў сабраліся ў актавай зале, каб абмеркаваць тэму «У адзінстве народа – сіла незалежнай дзяржавы».



Падача інфармацыі была падзелена на тры блокі: "Народнае адзінства-залог шчаслівай будучыні Беларусі"; “Усебеларускі народны сход- падводзім вынікі, плануем будучыню"; “Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь: на варце бяспекі і суверэнітэту”.

Пры абмеркаванні пытання "Народнае адзінства-залог шчаслівай будучыні Беларусі" вучні 8-11 класаў падкрэслілі неабходнасць згуртаванасці народа ў сучаснай сітуацыі, звярнулі ўвагу, што талерантнасць, памяркоўнасць, узаемапавага, сяброўства - гэта традыцыйныя гістарычныя рысы, уласцівыя беларусам. Аб Усебеларускім народным сходзе расказаў запрошаны госць Семяняка В. М., член Савета Палаты прадстаўнікоў, дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу. Старшакласнікі мелі магчымасць задаць пытанні госцю. Дыялог атрымаўся змястоўным. Разглядаючы пытанне "Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь: на варце бяспекі і суверэнітэту" вучні прыйшлі да высновы, што святы абавязак кожнага грамадзяніна- захаваць мір і парадак на нашай зямлі.

## Единый день безопасности




Жизнь в современном мире интересна и насыщена, а порой случаются неожиданные события, несущие всякие опасности, которые нельзя предугадать. Поэтому каждый человек должен знать, как себя вести в чрезвычайной ситуации.

В рамках единого дня безопасности в нашей школе с 22.02 по 01.03 согласно плана проводились: интеллектуальные игры, викторины, творческие конкурсы. Учащиеся получали общие сведения о наиболее вероятных источниках опасностей и угроз, способах и средствах обеспечения безопасности в ситуациях, с которыми они могут столкнуться в жизни.



## Народны каляндар. Люты




**Люты** - апошні месяц зімы. У народзе яго называюць па-рознаму: «лютень», паколькі бываюць яшчэ ў гэты час лютыя маразы, а таксама «бакі грэй», так як пачынае ўжо праглядваць сонейка і прыпякаць бакі. Існуе прымаўка: **"Люты - месяц люты, пытаецца: як абуты?".**

Стагоддзямі назапасілася шмат народных прыкмет лютага, па якіх можна прадбачыць будучыя лета, восень і зіму, ураджай, надвор'е на бліжэйшыя дні.

### Прыкметы аб надвор'і ў лютым



У пачатку лютага цёпла, растае снег - да добрага ўраджаю.

Калі люты халодны - да спрыяльнага лета.

Люты халодны і сухі - жнівень гарачы.

Люты цёплы - да халоднай вясны, а марозны - да спрыяльнага лета.

Яркія зоркі ў лютым - да марозу, цьмяныя - да адлігі.

Калі люты выдасца дажджлівым, то такімі ж можна чакаць вясну і лета.

Пагодлівы люты прадвесціць засуху летам.